Рэутовіч Я.М.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## УДАСКАНАЛЬВАННЕ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ХАРАВЫХ ТВОРАЎ

Вядома, што курс харавой аранжыроўкі складаецца з дзвюх тэматычных частак: пераклад харавых партытур і стварэнне новых для розных тыпаў і відаў хароў на падставе аднагалосных песень альбо рамансаў з акампанементам. Дзеля гэтага ў працэсе навучання студэнты павінны паслядоўна набываць неабходныя веды ў галіне музычна-тэарэтычных і хоразнаўчых дысцыплін, добра ведаць кампаненты музычнай фактуры, вывучаць сродкі мастацкай выразнасці і віды харавога выканання.

Трэба мець на ўвазе, што калі першая частка харавой аранжыроўкі -- пераклад харавых партытур -- з'яўляецца амаль чыста тэхнічнай, то другая яе частка -- стварэнне харавых партытур -- патрабуе ад студэнтаў асабістай творчай работы. Менавіта яна садзейнічае развіццю творчай фантазіі, выяўленню мастацкай індывідуальнасці студэнтаў, дае ім магчымасць удасканальваць свае прафесійныя веды, здольнасці і навыкі.

Аналіз хормайстарскай дзейнасці выхаванцаў кафедры харавога мастацтва красамоўна сведчыць, што лепшыя творчыя дасягненні належаць тым, хто дасканала валодае тэхнікай аранжыроўкі і стварае партытуры з усебаковым улікам выканальніцкіх магчымасцей сваіх творчых калектываў. Гэта заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь Лявон Воўчак, кіраўнікі ўзорных хароў Антон Літоўка, Уладзімір Ліпскі, Наталля Баяльская, Уладзімір Комар, Алесь Лях і інш.

На жаль, у сённяшні час выкладанне харавой аранжыроўкі ва універсітэце культуры ажыццяўляецца без уліку гэтага вельмі значнага патрабавання часу. Менавіта таму мы не маем магчымасці прывесці прыклады выканання нашымі харавымі і вакальнымі калектывамі апрацоўкі ці аранжыроўкі, зробленай студэнтамі. Гэта тым больш не зразумела, бо на кафедры ў якасці выкладчыкаў аранжыроўкі працуюць два прафесійных кампазітары.

На наш погляд, каб пазбавіцца ад названых вельмі значных недахопаў і ўдасканаліць методыку выкладання гэтай дысцыпліны, неабходна ажыццявіць наступнае:

1) перагледзець навучальныя планы і праграмы па ўказанай дысцыпліне з улікам пашырэння яе творчай часткі -- стварэнне новых харавых партытур;

2) распрацаваць метадычны дапаможнік па творчай частцы харавой аранжыроўкі на прыкладах беларускага рэпертуару;

3) аднавіць нотныя прыклады з метадычнымі ўказаннямі па харавой аранжыроўцы, складзеныя Корсакам Н.Ф. у 1983 г.;

4) штогод праводзіць конкурсы на лепшую студэнцкую аранжыроўку, апрацоўку, пераклад, кампазіцыю;

5) з мэтай заахвочвання студэнтаў лепшыя творчыя работы ўключаць у рэпертуар харавых калектываў і ансамбляў кафедры.

Актывізацыі творчай работы і развіццю прафесійных здольнасцей студэнтаў, на наш погляд, будзе садзейнічаць арганізацыя індывідуальных заняткаў па аранжыроўцы двойчы на тыдзень па 0,5 гадзіны замест заняткаў адзін раз, але па гадзіне.

Гэту прапанову, нам здаецца, трэба праэксперыментаваць спачатку з невялікай групай студэнтаў старэйшых курсаў.

Ярохіна С.К.,
дацэнт

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТА-ХОРМАЙСТРА НАД ВАКАЛЬНА-СІМФАНІЧНЫМ РЭПЕРТУАРАМ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

Адметнай рысай дырыжорскай дзейнасці як прафесійнай, так і самадзейнай з'яўляецца работа над харавым творам без удзелу свайго "інструмента" -- хору. Таму ў практыцы харавога выканання ўсталявалася некаторая перыядычнасць творчага працэсу асваення партытуры.

Мы прапануем агульныя метадычныя палажэнні, якія дапамогуць арганізаваць студэнтухормайстру сваю самастойную работу на прыкладах буйных кантатных твораў беларус-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ